# Вярнуць зямлі яе сілу

У Беларусі распрацоўваецца Нацыянальная праграма барацьбы з дэградацыяй земляў.

Надзёйнасць гэтай праблемы асэнсавалі не толькі вучоныя, эколагі, але і кіраўнікі, і простыя людзі. Ужо сёння зямля сігналізуе; час рабіць тэрміновыя захады па выпраўленні памылак, якія зрабіў чалавек, выкарыстоўваючы зямлю ў сваіх інтарэсах. З твару нашых ландшафтаў знікаюць тарфянікі, калісьці ўрадлівыя глебы пераўтвараюцца ў пясок, над краінай праносяцца пылавыя буры, смерчы, небывалыя ліўні... Гэта праблема не толькі Беларусі. І гэта не толькі адна асобная праблема. Дэградацыя зямель — бяда планетарнага маштабу, і яна звязана з іншымі глабальнымі экалагічнымі праблемамі чалавецтва. Вырашыць іх магчыма толькі агульнымі намаганнямі.

Напачатку жніўня ў Гарадку Віцебскай вобласці ў рамках рэалізацыі праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь» адбыўся рэгіянальны семінар «Ахова земляў глебаў ад эрозіі і яе адлюстраванне ў Нацыянальнай праграме дзеянняў Рэспублікі Беларусь па барацьбе з дэградацыяй земляў». Пра тое, што хаваецца за гэтымі «разумнымі словамі і якім чынам гэта датычыцца выпрабаванняў, якія нам наладжвае прырода, мы распыталі кіраўніка экспертнай группы праекта ЕСПРААН Вялянціна Яцухну.

— Чаму тэма барацьбы з дэградацыяй земляў для нас цікавая?

—Таму што зямельныя рэсурсы — нацыянальны набытак Беларусі. Яны выкарыстоўваюцца ў розных сектарах эканомікі. І, натуральна, у найбольшай ступені — у аграрным. Сёння прыкладна 45 працэнтаў тэрыторыі Беларусі — сельскагаспадарчыя ўгоддзі. З іх прыкладна трыццаць працэнтаў — паша, якая выкарыстоўваецца найбольш інтэнсіўна.

З прававога пункту погляду зямельныя рэсуроы — гэта нерухомасць. Разам з тым, гэта аб'ект прыроднага асяроддзя. Таму зямля адыгрывае важную ролю як эканамічны рэсурс і разам з тым з'яўляецца экалагічным складальнікам. Гэта дзве вельмі ўзаемазвязаныя рэчы. Ад таго, як мы будзем гаспадарыць на зямлі, будзе залежаць і яе эфектыўнасць. Ад спалучэння двух гэтых фактараў залежыць дабрабыт нашых людзей.

Акрамя таго, зямля з'яўляецца тарытарыяльным рэсурсам. Усе віды гаспадарчай дзейнасці, пачынаючы з сельскай гаспадаркі і заканчваючы гарадамі, размяшчаюцца на зямлі. І гэта яшчэ адна прычына ашчадна да яе ставіцца. Тым больш, што нагрузкі, антрапагеннае ўздзеянне робяцца ўсе большымі.

Ашчаднае стаўленне да зямлі абумоўленае яшчэ і глабальнымі экалагічнымі зменамі. Сёння чалавецтва мае тры ключавыя экалагічныя праблемы. Першая — захаванне біялагічнай разнастайнасці расліннага і жывёльнага свету. Другая—змена клімату. Трэцяя глабальная праблема — дэградацыя земляў. Усе тры праблемы планетарнага маштабу, быццам бы асобныя, але ў рэальнасці ўзаемазвязаныя.

Таму ў свой час і былі прынятыя тры прыродаахоўныя канвенцыі ААН, якія датычыліся гэтых праблем. Беларусь падпісала ўсе тры. Сёння надаецца вялікая ўвага іх выкананню. Вось чаму мы ўзяліся распрацаваць мерапрыемствы па барацьбе і прадухіленні дэградацыі земляў.

— Ці ёсць асаблівасці дэградацыі земляў на Беларусі?

Так. Найбольш балючая тэма для нас — дэградацыя тарфянікаў, асабліва — асушаных. Пад сельгасугоддзямі такіх мільён гекгараў з дзевяці мільёнаў. Яшчэ адна наша праблема — дэградацыя земляў у выніку і здабычы карысных выкапняў, асабліва будаўнічых матэрыялаў, жвірова-пясчаных сумесяў торфу. Прыкладна 280 тысяч гектараў сення ў нас выпрацаваных торфараспрацовак. Гэта плошча паўтара сярэдкіх адміністрацыйных раёнаў Беларусі. І гэта раны на целе беларускага ландшафту.

А мы ж яшчэ маем разную хімічную прамысловасць. Два нафтаперапрацоўчыя заводы, азотны завод, цэментную вытворчасць,

вялізнае прадпрыемства па здабычы калійных соляў. Прычым, у апошнім выпадку, вытворчасць сканцэнтравана на невялікай плошчы. Так, у свеце існуе шэраг такіхі камбінатаў: у Германіі, Канадзе і Чылі. Але яны меньшыя па магутнасці, і не ў такой ступені сканцэнтраваныя. Сённня, у выніку здабычы калійнай солі, якая доўжыцца- ўжо 50 гадоў, на плошчы ў 5 тысяч гекгараў сабралася прыкладна 750 млн тон адходаў. Аднак калі ацэньваць уздзеянне гэтых адходаў на навакольнае асяроддзе, то плошчу гэту трэба памножыць у некалькі разоў.

Калі мы кажам пра транспартныя магістралі, то таксама павінны разумець, што гэта не топькі 60 тысяч кіламетраў дарог з цвёрдым пакрыццём, колькасць якіх расце, альбо 4 працэнты тэрыторыі краіны. Гэта яшчэ прыкладна 3 мільёны аўтамабіляў, кожны з якіх — крыніца забруджвання, у тым ліку і глебы. У Мінску 80 працэнтаў забруджвальнікаў складае аўтамабільны транспарт, і толькі 20 — стацыянарныя крыніцы.

І, безумоўна, вялікая наша трагедыя — наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Мы таксама адносім гэта да працэсаў дэградацыі земляў. Бо забруджванне адбылося доўгатэрміновае, на многія дзясяткі гадоў.

— Ці няма тут благога без добрага?

Чалавек вымушаны быў пакінуць вялікія тэрыторыі дзе раслінны і жывёльны свет цяпер ад яго не церпіць.

— Для таго, каб нейтралізаваць наступствы аварыі, мы, зразумела, выкарыстоўваем гэтыя тэрыторыі пад прыроднын экасістэмы, але хацелася б, каб гэта было не такой цаной. Чарнобыльская катастрофа —тэхнагеннае забруджванне, якое накрыла 25 працэнтаў тэрыторыі нашай краіны. Гэта 1,6 млн гектараў сельгасугоддзяў і 1,8 млн гектараў лясоў. 70 працэнтаў радыенуклідаў выпала на беларусі.

Формаў дэградацыі шмат, і каб спыніць гэты працэс, мы павінны выпрацаваць шэраг мерапрыемстваў. Прычым мерапрыемствы і будуць датычыцца розных сактараў эканомікі, і будуць міжгаліновымі. Патрабуюцца намаганні ўсёй дзяржавы, а не нейкага аднаго міністэрства, ведамства альбо адміністрацыйнага органа. Таму была пастаўлена задача скласці Нацыянальную праграму дзеянняў па барацьбе з дэградацыяй земляў. Дарэчы, гэтага патрабуе і Канвенцыя, якую мы падпісалі.

Гэта стала адной з передумоў з'яўлення праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН -Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь». Праект падтрыманы міжнароднай супольнасцю, якая дапамагае ў тым ліку і фінансава, бо ён вырашае глабальную задачу. Наша Беларусь — частка Еўропы і свету, а рашэнне экалагічных праблем патрабуе намаганняў як асобных краін, так і ўсяго чалавецтва. Экалагічныя праблемы не маюць нацыянальных межаў.

— Калі Беларусь дапучылася да Канвенцыі па барацьбе з апустыньваннем/дэградацыяй земляў?

— У 2001 годзе. У 2002 і 2006 гадах мы распрацавалі Нацыянальныя даклады аб стане праблемы. Потым, на падставе гэтых дакладаў, прапанавалі першачарговыя мерапрыемствы. А зараз мы павінны распрацоўваць сістэму мерапрыемстваў па барацьбе з дэградацыяй земляў на агульна-нацыянапьным узроўні.

— Толькі пасля гэтага пачнуцца нейкія практычныя дзеянні?

— Яны былі і раней, але не было сістэмы, гэта былі асобныя мерапрыемствы.

— На колькі праблема датычыцца іншых краін Еўропы?

— Яна не менш актуальная і там, і вельмі актыўна рашаецца ў Германіі, Францыі, іншых краінах. Некаторыя сітуацыі там яшчэ больш абвостраныя. Напрыклад, сёння Грэцыя, поўдзень Італіі ў пажарах, бо там міжземнаморскі клімат, бясконцая гарачыня і нават адна запалка можа падпаліць усю краіну.

— Як мясцовыя ўлады ў Беларусі ставяцца да распрацоўкі праграмы?

— Вельмі зацікаўлена. Напрыклад, на семінар у Любанскім раёне прыехалі спецыялісты з іншых рэгіёнаў: Ганцавічаў, Лунінца, Пінска, Старобіна, Сапігорска... Праблема гэта ўсіх хвалюе, і, што вельмі важна, яна асэнсаваная. Літаральна на нашых вачах за апошнія 20—30 гадоў з беларускіх ландшафтаў зніклі многія тарфянікі. Гэта хвалюе не толькі з пазіцыі экалогіі, але з пазіцыі эканомікі: там, дзе раней вырошчваліся сельскагаспадарчыя культуры, сёння — пясок. Мы пакуль не кажам пра экалагічную міграцыю — перасяленне людзей з гэтых раёнаў. Але што можа

гарантаваць, што гэтага праз некаторы час не адбудзецца?

— Сёлетняй вясной на Случчыне я была сведкай пылавай буры. Старыя людзі казалі, што яны такога не бачылі за ўсё сваё жыццё. Гэта таксама вынік дэградацыі земляў?

— Безумоўна. На дэградацыю земляў уплываюць два фактары: нерацыянальнае выкарыстоўванне зямельных рэсурсаў чалавекам і глабальныя экалагічныя змены, сярод якіх самая важная — змена клімату. У Беларусі змены клімату выклікаюць засуху і экстрэмальныя кліматычныя з'явы.

— Такія, як ліпеньскія ліўні? — А таксама моцныя веснавыя і восеньскія замаразкі, ураганы, надзвычайная хуткасць вятроў. Так рэагуе наша біясфера. Калі мы хварэем, у нас падымаецца тэмпература, нас калоціць. Біясфера — таксама жывы арганізм. Вось чаму ў нас у красавіку была засуха, пылавыя буры, а ў чэрвені ў Мінску выпала дзве месячныя нормы ападкаў.

— Бульбяныя палі ў некаторых раёнах нагадвалі рысавыя — яны стаялі ў вадзе.

— Гэта цяжка сабе ўявіць, такога ніколі раней не было. Прычым дажджы мелі ліўневы характар, яны не вылі расцягнутыя ў часе. 18 ліпеня 2006 года пасля двухмесячнай засухі ў Мінску выпаў дождж — палова месячнай нормы, але гэтага не было прыкметна, уся вільгаць была паглынутая ссушанай зямлёй. Такія кантрасты балюча адбіваюцца на аграрным сектары. Прыкладна 40-50 працэнтаў ураджаю залежыць ад надвор'я.

—Якія меры могуць быць прадугледжаны Нацыянальнай праграмай?

— Мы павінны прыняць адаптыўныя альбо змякчальныя меры. Яны маюць розны характар. У аграрным сектары павінна быць асаблівая структура пасяўных плошчаў. Напрыклад, у засушлівыя гады цудоўна адчувае сябе кукуруза. На паўднёвыя рэгіёны Беларусі фактычна наступае лесастэп, туды ўжо пранікла 240 відаў паўднёвых раслін, якіх ніколі раней тут не было. Зямля гэта адчувае і рэагуе. А мы павінны альбо прыстасавацца да гэтых зменаў, альбо па магчымасці іх зменшыць.

Група экспертаў даўно працуе над гэтай праблемай. Нам бачыцца, што некалькі напрамкаў павінна быць адлюстравана ў Праграме гэта, перш за ўсе, удасканаленне заканадаўчай і нарматыўнай базы. Квінтэсенцыяй павінен стаць Закон аб ахове зямлі і глебы, дзе дакладна былі б вызначаны мэты і задачы аховы земляў. Гэты Закон нам вельмі патрэбны. Бо пастановы, падзаконныя акты ў нас ёсць, але яны не выконваюцца. У нас сем пастаноў Саўміна па ахове тарфянікаў, пачынаючы з 70-х гадоў. Але нічога не змянілася. Таму што няма Закона.

Асаблівая ўвага ў Праграме будзе нададзена тэрытарыяльнаму планаванню. У нас ёсць такое планаванне, але яно ўнутрыгаліновае, а патрэбны адзіны план, адзіная сістэма для ўсіх. Каб у ім было месца аграрніку, і транспартніку, і турысту...

Для аграрных рэгіёнаў вельмі перспектыўныя схемы землеўладкавання. Сёння такія ствараюцца для 48 раёнаў, яны павінны быць гатовыя да 2012 года. Паглядзеўшы на такую схему, любы кіраўнік раёна адразу скажа, дзе ў яго будзе рэкрэацыйная зона, дзе развіццё пасяленняў, дзе сельская гаспадарка.

У Праграме будзе таксама прадугледжана аднаўленне і шматфункцыянальнае выкарыстанне выпрацаваных тарфянікаў. Сення дзейнічае вельмі добры міжнародны праект, мэта якога аднавіць 17 тысяч гектараў балот на месцы былых торфараспрацовак. Раней там абавязвалі ствараць сельгасугоддзі, але не заўсёды гэта магчыма. Ды сёння і без гэтага ў сельгассектары дастаткова палёў, да таго ж гэта затратны метад. Лепш стварыць там калі не балота, дык вадасховішча, зону адпачынку, альбо пасадзіць лес.

Не меньш актуальная дэградацыя тарфянікаў, на якіх вырошчваюцца сельскагаспадарчыя культуры. Трэба тэрмінова прымаць меры па спыненні гэтага працэсу. На спустошаных участках можна, напрыклад, пасадзіць вербы, якія кожныя тры гады скошваць спецыяльным камбайнам, каб атрымліваць таннае паліва. Гэта дазволіць спыніць веграваую эрозію і верне зямлі ў гаспадарчую дзейнасць.

Важна, што меры прапісаныя ў Праграме, не будуць аднаразовыя, яны будуць разлічаны на ўвесь час. Праграма не будзе адзіным дакументам, які цалкам у кампетэнцыі Міністэрства аховы прыроды. Мінпрыроды — галоўны выканаўца, але Праграма будзе ўзгаднацца і ў Мінсельгаспраграме, і ў Дзяржкаммаёмасці, і ў Міністэротве лясной гаспадаркі...

Па вялікім рахунку, у нас значная частка насельніцтва звязана з зямлёй непасрэдна: 28 працэнтаў жыве ў сельскай мясцовасці, аб 50 тысяч гараджан валодаюць зямельнымі ўчасткамі. Да таго ж зямля мае не толькі рэсурсную каштоўнасць, але нешта бальшае — духоўны пачатак. Нездарма мы кажам «родная зямля». Таму праект гэты датычыцца кожнага з нас.

Размаўляла Вольга Мядзведзев.

Каментарый тэматычнага каардынатара праекта Еўрапейскага саюза. Праграмы развіцця ААН «Пабуцова патэнцыялу ў галіне стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь» Вадзімв Лажэчкі:

— Нацыянальны выканаўца праекта — Міністэрства прыродных, рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Бюджэт праекта большы і за паўмільёна долараў. Рэалізацыя яго пачалася ў лістападзе 2008 года і павінна завяршыцца ў снежні 2010 года. Умоўна праект можна падзяліць на тры галоўныя складальнікі: развіццё патэнцыялу ў галіне і стратэгічнай экалагічнай ацэнкі ў Беларусі, садзейнічанне арганізацыі інфармацыйна-аналітычных цэнтраў канвенцый ідапшога ў рэалізацыі прыродаахоўных пагадненняў, сярод якіх і Канвенцыя па барацьбе з апустыньваннем/дэградацыяй земляў.

Па тэматыцы дэградацыі земляў мы правялі ўжо некальні семінараў, у рамках якіх звярталі ўвагу на гэту праблему і абмяркоўвалі яе з людзьмі, якія маюць непасрэднае дачыненне да тэмы, што павінна і ўвайсці ў Нацыянальную праграму.

Пасля семінара, які адбыўся ў жніўніў Гарадку Віцебскай вобласці, Міністэрствам прыроды зацверджана структура Нацыянальнай праграмы. Гэта паказчык таго, што рухаемся мы ў правільным кірунку. Чарговы семінар адбудзецца ў канцы жніўня — пачатку верасня ў адным з раёнаў Гродзенскай вобласці.

Нашы семінары адкрытыя для ўсіх. Запрашэнні на IX высылаюцца ў міністэрствы, ведамствы, спецыялістам па землекарыстанні, вучоным, прадстаўнікам улады і няўрадавых арганізацый... Іншымі словамі, праграма адкрытая для абмеркавання і прынящця заўвагі прапаноў па яе паляпшэнні.

***В.Вярнуць***

**Источник:** Звязда.- 2009.- 20 жн.-С.1-2.